# Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

Цана 2 кап.

№ 48 (954) Снежань, 1966 г.

Год выдання 11-ы






# 5 СНЕЖНЯ — ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ СССР

ГРАМАДЗЯНЕ СССР МАЮЦЬ ПРАВА НА ПРАЦУ, ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ ПРАВА НА АТРЫМАННЕ ГАРАНТАВАНАЙ РАБОТЫ З АПЛАТАЙ ПРАЦЫ Ў АДПАВЕДНАСЦІ З ЯЕ КОЛЬКАСЦЮ І ЯКАСЦЮ.

*(З Канстытуцыі СССР).*

Ужо на працягу першай пяцігодкі (1928—1932 гг.) у Савецкім Саюзе было поўнасцю ліквідавана беспрацоўе — гэты біч буржуазных краін. Іншаземныя турысты заўсёды са здзіўленнем заўважаюць у любым нашым горадзе мноства аб'яў: «Патрабуюцца на работу»... Усе, хто заканчвае сярэднія спецыяльныя або вышэйшыя навучальныя ўстановы, разам з дыпломам атрымліваюць накіраванне на працу. Райвыканкомы займаюцца ўладкаваннем выпускнікоў школ, каб ніводзін з іх не застаўся за бортам жыцця.

ГРАМАДЗЯНЕ СССР МАЮЦЬ ПРАВА НА АДПАЧЫНАК.

*(З Канстытуцыі СССР).*

Толькі ў Беларусі маецца 45 санаторыяў і 14 дамоў адпачынку, дзе працоўныя могуць правесці свой водпуск па льготных пуцёўках прафсаюзаў. Акрамя таго, тысячы жыхароў нашай рэспублікі штогод адпачываюць у здраўніцах Крыма, Каўказа, Закарпацця і Прыбалтыкі. Усяго па лініі прафсаюзаў працоўным было выдадзена сёлета 145 тысяч пуцёвак.

ГРАМАДЗЯНЕ СССР МАЮЦЬ ПРАВА НА МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ Ў СТАРАСЦІ, А ТАКСАМА — У ВЫПАДКУ ХВАРОБЫ І СТРАТЫ ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦІ.

*(З Канстытуцыі СССР).*

За апошнія дзесяць год расходы на пенсійнае забеспячэнне ў нашай краіне павялічыліся больш чым у 3 разы. У Беларускай ССР за 1965 год яны склалі каля 200 мільёнаў рублёў (80 мільёнаў выплочвацца пенсіянерам-калгаснікам). Усяго ў рэспубліцы атрымлівае пенсіі 1 239 тысяч чалавек.

ГРАМАДЗЯНЕ СССР МАЮЦЬ ПРАВА НА АДУКАЦЫЮ.

*(З Канстытуцыі СССР).*

У 1965—66 навучальным годзе школы, тэхнікумы і ВНУ Беларусі наведвала 2 491,1 тысячы чалавек. У рэспубліцы працуе 13 000 школ, 122 сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, 28 вышэйшых навучальных устаноў. На 10 000 насельніцтва БССР прыходзіцца 80 студэнтаў ВНУ. Гэта больш, чым у любой капіталістычнай краіне Еўропы.

УСЯ ЎЛАДА Ў СССР НАЛЕЖЫЦЬ ПРАЦОЎНЫМ ГОРАДА І ВЁСКІ Ў АСОБЕ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

*(З Канстытуцыі СССР).*

У ліку 1 517 дэпутатаў Вярхоўнага Савета СССР сёмага скліканння — 404 рабочыя, 294 калгаснікі, 104 кіраўнікі і спецыялісты прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў. Астатнія — дзеячы культуры і мастацтва, ваеннаслужачыя, партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя работнікі. У вышэйшы орган дзяржаўнай улады ўваходзяць прадстаўнікі 57 нацыянальнасцей і народнасцей нашай краіны.

**30** ГОД назад у Маскве быў прынят Асноўны Закон Савецкага Саюза—Канстытуцыя СССР. За гэтыя гады наша краіна дабілася велізарных поспехаў ва ўсіх галінах жыцця. Не засталася без змен і тэрыторыя Маскоўскага Крамля. У архітэктурны ансамбль старажытных палацаў і вежаў упісаўся ажурны сучасны будынак Палаца з'ездаў. Перад ім на флагштоках развяваюцца 15 сцягоў, сімвалізуючы адзінства і раўнапраўе 15 саюзных рэспублік.

Фота Ул. КІТАСА.

# СЕГОДНЯ В НОМЕРЕ

## ДЛЯ ТЕХ, КТО НЕ ЧИТАЕТ ПО-БЕЛОРУССКИ

Тридцатой годовщине Советской Конституции посвящена 1-я стр. сегодняшнего номера. Наша Конституция предоставила народу право на труд, отдых, образование, на материальное обеспечение в старости, в случае болезни и потери трудоспособности. В отличие от буржуазных конституций она не только дала эти права, но и гарантирует их осуществление.

**«ДЗЕНЬ, ПОЎНЫ ЎРАЖАННЯЎ»** (3 стр.) — так называется рассказ об одном дне трудовой Орши. Орша — один из древних белорусских городов. Место, где Оршица впадает в Днепр, — его сердце. Именно здесь находился когда-то замок, в котором держал в заточении свою дочь жестокий вельможа. Было ли все так, как рассказывает предание, установить сейчас трудно, а вот то, что сегодняшняя Орша может преподнести много приятных сюрпризов — чистая правда. Более 11 000 разных видов льняных изделий выпускает льнокомбинат. Юбилейный пятитысячный станок собран на станкостроительном заводе «Красный борец». Широкой известностью пользуется продукция завода швейных машин. В парке Героев величественно возвышается Курган бессмертия. Его насыпали жители Орши — каждый принес сюда горсть земли в память о погибшем брате, сыне, муже...

Соотечественникам Марии и Францу Ржечицким, Арсению Борисенку во Франции, Георгию Грицкевичу в Австралии мы рассказываем об их родных местах в статье **«ТУТ ПРАХОДЗІЛА ВАША ДЗЯЦІНСТВА»** (5 стр.). В деревне Коптево под Дисной хорошо помнят Арсения Борисенка и его отца Василия. Беднее их трудно было найти. Арсений с сестрами с детства батрачили у богатеев. Теперь Коптево входит в богатый колхоз «Искра». Здесь выстроена новая школа, клуб с широкоэкранной киноустановкой. 9 тракторов, 3 комбайна работают на колхозных полях. За 9 месяцев этого года доход артели составил 205 тысяч рублей. Разросся за послевоенные годы городок Дисна. В нем построено более 500 новых домов. Население обслуживают 16 магазинов. Работают маслозавод, хлебозавод, промкомбинат и другие предприятия. А в 30 километрах от Дисны зажег свои огни молодой город белорусских нефтяников — Новополоцк.

9 декабря белорусская общественность отмечает 75-летие со дня рождения поэта-демократа Максима Богдановича. Его творчество от первой до последней песни принесено на алтарь служения народу, борьбы за его лучшее будущее. Идейная направленность поэзии Богдановича определила и эстетические взгляды поэта, и художественные особенности его неповторимого литературного таланта, созревшего под влиянием устного народного творчества, передовой русской литературы и произведений античных авторов. Богданович много сделал для усовершенствования белорусского стихосложения, которое благодаря ему стало более гибким, звучным, музыкальным. Несмотря на то, что он прожил очень короткую жизнь (он умер в возрасте 25 лет), его творчество заняло прочное место в нашей литературе и получило широкий отзвук за рубежом. Ему дана высокая оценка в работах зарубежных исследователей. Литераторы мира обращаются к чистому источнику поэзии Богдановича, снова и снова находя в нем красоту наших полей и лесов, преданий и легенд. Выдающемуся поэту посвящены статьи **«НЕПАЎТОРНЫ ТАЛЕНТ»** и **«ВЕРШЫ ГУЧНЫЯ, ЯК ЗВОН»** (6 стр.).

# ПАДЗЕІ * ЛЮДЗІ * ФАКТЫ * ПАДЗЕІ * ЛЮДЗІ * ФАКТЫ

* ПАДЗЕІ * ЛЮДЗІ * ФАКТЫ * ПАДЗЕІ * ЛЮДЗІ * ФАКТЫ *

### МІНСК

У памяшканні Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна адбылася першая рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя па фізіцы. У яе рабоце прынялі ўдзел выкладчыкі фізікі беларускіх вну, а таксама фізікі прыбалтыйскіх рэспублік, Масквы і Ленінграда. З цікавымі дакладамі на канферэнцыі выступілі вядучыя вучоныя краіны.

### РЭЧЫЦА

Новы фантан нафты ўдарыў са шчыліны № 14 Рэчыцкага месцанараджэння. Да гэтага часу тут былі вядомыя толькі тры прамысловыя гарызонты залежаў нафты. Цяпер іх стала чатыры.

### ВІЦЕБСК

У абласным цэнтры здадзена ў эксплуатацыю новая гарадская дзіцячая бальніца. У ёй размешчаны аддзяленні для дзяцей груднога ўзросту, хворых рэўматызмам, захворваннямі дыхальных шляхоў, а таксама фізіятэрапеўтычнае аддзяленне з водалячэбніцай. Пабудаваны таксама навучальны корпус на 210 месц для кафедры дзіцячых хвароб медыцынскага інстытута. Зараз у абласным цэнтры налічваецца каля трыццаці медыцынскіх устаноў.

### СМАРГОНЬ

Нядаўна вярнуліся з паездкі ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку самадзейныя артысты Смаргонскага ансамбля песні і танца імя Агінскага. Два тыдні правялі яны ў ГДР. Смаргонцы выступалі ў Берліне, Дрэздэне, Котбусе і іншых гарадах. Пасля цікавай паездкі аматары самадзейнага мастацтва з вялікім стараннем узяліся за падрыхтоўку новай праграмы. Яны пакажуць свае работы польскім сябрам.

### БАБРУЙСК

Звыш 40 год працуе мэблевая фабрыка імя Халтурына. Тут склаліся свае добрыя працоўныя традыцыі, выраслі выдатныя майстры-мэблеўшчыкі. Аб умелых руках мясцовых чырвонадрэўшчыкаў гаворыць той факт, што мэбляй з маркай фабрыкі імя Халтурына абсталяваны палац навукі і культуры ў Варшаве, Маскоўскі універсітэт імя Ламаносава, Крамлёўскі Палац з'ездаў і рад іншых будынкаў.

Вясной будучага года фабрыка ўпершыню будзе дэманстраваць сваю прадукцыю на Лейпцыгскім міжнародным кірмашы.

### СТОЎБЦЫ

Аб росце культуры і дабрабыту хлебаробаў сельгасарцелі імя Мічурына сведчаць не толькі новыя дамы, электрычнасць, тэлевізары, радыёлы. Надзейна ўвайшлі ў быт калгаснікаў газеты і часопісы. Калі пазалетась кожная тысяча жыхароў арцелі атрымлівала 800, дык у другім паўгоддзі гэтага года ўжо ішло на такую колькасць насельніцтва 840 газет і часопісаў. У наступным годзе калгасныя паштальёны будуць насіць 925 экземпляраў перыядычных выданняў на кожную тысячу чалавек.

### ВІЦЕБСК

У саўгасе «Селюты» завершана будаўніцтва першых трох двухпавярховых жылых дамоў з усімі выгодамі. У іх спраўляць наваселле 48 сямей рабочых і служачых гаспадаркі. К канцу года ўвойдзе ў строй дзіцячы камбінат.



**Вучоныя краіны распрацавалі новы спосаб ператварэння электрычнай энергіі ў механічную — электрагідраўлічны эфект, які называюць «падводнай маланкай». Вывучэннем гэтага метаду займаецца і група навуковых супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР. На здымку: старшы інжынер-канструктар лабараторыі Юрый ЗВЯРХОЎСКІ падрыхтоўвае спецыяльную апаратуру звыш высокай каморы іскравога разраду ў вадкасці.**

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ.



Гродна. Новы будынак майстэрань «Аблпраекта» па вуліцы імя Дзяржынскага.

Фота А. ПЕРАХОДА.

### КАЛІНКАВІЧЫ

Калінкавіцкая звераферма набыла шырокую вядомасць сваімі «чарнабуркамі». Сёлета яна папоўнілася новымі насельнікамі. З Падмаскоўнага навукова-даследчага інстытута і з Латвіі сюды перасялілася 630 белых і блакітных норак. За дзесяць месяцаў гэтага года ферма атрымала звыш ста тысяч рублёў прыбытку.

### ЧЭРЫКАЎ

Расшыраецца гандлёвая сетка ў раёне. Нядаўна закончана будаўніцтва новага універмага ў вёсцы Рэчыца—цэнтры калгаса імя Ільіча. Прыгожы павільён-магазін абсталёўваецца пад зялёным шатром сосен у вёсцы Багданаўка. Рабочыя саўгаса «Шароеўка» атрымалі нядаўна ў падарунак добра абсталяваную сталовую.

### СТОЛІН

Калгас «17-е верасня» з'яўляецца шматгаліновай гаспадаркай. Вытворчасць прадукцыі паляводства і жывёлагадоўлі няспынна ўзрастае. Гэта заслуга і спецыялістаў. На розных участках арцельнай вытворчасці працуюць хлебаробы з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Шмат хто з работнікаў паляводства і жывёлагадоўлі вучыцца завочна.

### ГРОДНА

Гродзенскі скульптар В. Даненкаў закончыў работу над скульптурай стваральніка Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і заснавальніка Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна. Вышыня фігуры—3 метры 25 сантыметраў. Яна будзе ўстаноўлена ў цэнтры гарадскога пасёлка Скідэль. В. Даненкаў прысвяціў свой твор 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

У гонар юбілею Савецкай улады скульптар стварыў вобразы бясстрашнай лётчыцы Героя Савецкага Саюза Вольгі Санфіравай, Героя Савецкага Саюза Веры Харужай.

### ДУБРОЎНА

Вёска Буда—цэнтр саўгаса імя Юрыя Смірнова. Тут вырасла шмат новых будынкаў. А нядаўна зманціравана аўтаматычная тэлефонная станцыя. Цяпер усе вытворчыя ўчасткі гаспадаркі маюць надзейную сувязь. Сувязісты рыхтуюцца да мантажу такіх станцый і ў іншых гаспадарках раёна.

### БРЭСТ

Краны Брэсцкага рачнога порта разгрузілі апошнія ў сёлетняй навігацыі баржы з крыварожскай рудой для ГДР. Звыш плана перапрацаваны дзесяткі тысяч тон народнагаспадарчых грузаў.

Але зіма яшчэ не скавала блакітныя магістралі. Рачнікі вобласці працягваюць вахту. З Пінска ў другі рэйс адправіўся цеплаход «Рэсь». Ён вязе муку для жыхароў Давыд-Гарадка. Аж да самага ледаходу будуць курсіраваць пасажырскія цеплаходы, якія звязваюць Пінск з прырэчнымі вёскамі Стахава, Качановічы і Старыя Коні.

ПАДЗЕІ * ЛЮДЗІ * ФАКТЫ * ПАДЗЕІ * ЛЮДЗІ * ФАКТЫ

КАРАЧЫ. На прычале Карачынскага порта стаяць дваццаць шэсць бульдозераў вытворчасці Чэлябінскага трактарнага завода. Іх даставіла савецкае судна «Дзмітрый Фурманаў». Гэта першая частка буйной партыі абсталявання, закупленага ў нашай краіне сельскагаспадарчым дэпартаментам Заходняга Пакістана. Бульдозеры будуць выкарыстаны пры асваенні новых зямель ў заходняй частцы краіны.

ТОКІО. Тут адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння дыпломаў замежных членаў Акадэміі навук СССР двум японскім прафесарам фізіку Хідэкі Юкава і біяхіміку Сіро Акаборы. Пасол СССР у Японіі В. Вінаградаў ад імя прэзідыума Акадэміі навук цёпла павіншаваў вучоных, адзначыў іх вялікі ўклад у развіццё японскай і сусветнай навукі. Сіро Акаборы і Хідэкі Юкава падзякавалі за аказаны ім гонар.

БОН. У Мюнхене зноў створана антыфашысцкая арганізацыя «Белая ружа», якая існавала там у час нацызму, паведамляе газета «Франкфуртэр рундшау». Тады ў яе састаў уваходзілі нямецкія студэнты — удзельнікі антыфашысцкага руху Супраціўлення, у тым ліку героі Супраціўлення брат і сястра Шоль, пазней пакараныя смерцю нацыстамі.

ПАРЫЖ. Прэзідэнт дэ Голь, выступаючы на пасяджэнні Савета Міністраў, падкрэсліў важнае значэнне франка-савецкага збліжэння і супрацоўніцтва. Гаворачы аб перспектывах маючага адбыцца візіту ў Францыю Старшыні Савета Міністраў СССР А. Касыгіна, дэ Голь заявіў, што гэта паездка «дазволіць лепш удакладніць становішча і развіваць адносіны ў адпаведнасці з падпісанымі пагадненнямі».

НЬЮ-ЙОРК. Агульная колькасць амерыканскіх войск у Паўднёвым В'етнаме к канцу мінулага тыдня дасягнула 360 000 чалавек, паведамляе карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Сайгона, спасылаючыся на заяву амерыканскага камандавання.

ХАНОЙ. Армія вызвалення і партызаны Паўднёвага В'етнама працягваюць наносіць цяжкія ўдары па амерыканскіх і марыянетачных войсках. Як паведамляе агенцтва ВІА, спасылаючыся на агенцтва «Вызваленне», паўднёвав'етнамскія патрыёты ў верасні — кастрычніку ў раёнах, размешчаных паміж правінцыямі Куангчы і Біньдзінь (у паўночнай частцы Паўднёвага В'етнама), вывелі са строю 15 468 салдат і афіцэраў праціўніка.



**За апошнія пяць год здабыча вугалю ў Мангольскай Народнай Рэспубліцы ўзрасла ў 1,6 раза. У раёне Дархана здадзен у эксплуатацыю буйнейшы вугальны кар'ер краіны — Шарынгольскі. На здымку: Шарынгольскі вугальны кар'ер.**

# ТАЙНА ПЯТИДЕСЯТИ СТРОК

А. ЗУБОВ, Л. ЛЕРОВ, А. СЕРГЕЕВ

[Начало в №№ 35—43, 45—47]

— Я прошу тебя, мой друг, не оставлять без внимания мисс Натали. Она заслуживает этого. — И он галантно поцеловал ей ручку. — Вспоминайте меня, когда будете вместе... Я даже разрешаю вам когда-нибудь выпить за мое здоровье... Но ни шагу дальше... — И ученый весело хохотал, обнимая своего друга.

И Натали смеялась. А ученый продолжал:

— Мисс Натали, я вас тоже прошу не забывать моего друга. Он пишет книгу о русской науке, и, может быть, ему потребуются какие-нибудь справки, или официальные справочники, или устная консультация. Если это вас не очень обременит, помогите ему. Я заранее благодарю вас.

«Друг» дал о себе знать через неделю после отъезда ученого: позвонил Наташе домой и пригласил ее в ресторан.

— Я хотел бы воспользоваться вашим любезным согласием помочь мне... Вы как-то говорили, что читали о последних открытиях советских пушкинистов. Мне хотелось бы побеседовать с вами на эту тему...

Они пили кофе по-турецки и французский коньяк. Говорили о русском балете и венском айс-ревю. Ну, конечно, и о пушкинистах. Дипломата очень заинтересовал тот факт, что какие-то потомки Пушкина оказались в родстве с английской королевой.

Они встретились раз, другой, третий. Как всегда, Наташа без умолку щебетала о маме, бабушке, дяде, институте, рассказывала о студенческих вечерах, на которые приезжают ребята из МГУ и МВТУ, о парне из МВТУ, который зачастил к ним на вечера и танцует только с нею. Так разговор зашел об МВТУ.

— Я хочу рассказать об этом великолепном институте в своей книге. И был бы очень признателен вам, если бы вы разузнали для меня некоторые детали обучения в нем. Вы, кажется, говорили, что ваш поклонник учится там? Или я ослышался?..

Даже не очень сметливый человек, услышав такую просьбу иностранного дипломата, должен был насторожиться. Но девушка выполнила и эту просьбу: поклонник ее оказался парнем весьма болтливым.

Наташа охотно встречалась с сотрудником посольства. Бывала у него дома. Иногда у нее появлялась потребность в диалоге с собственной персоной. «К чему это тебе?» «Ну просто так... Приятно время провести. К тому же это прекрасная разговорная практика». В ходе «практики» Натали с удивлением обнаружила, что сотруднику посольства хорошо известно имя ее дяди. Поначалу это несколько озадачило переводчицу. Но ненадолго. Посыпались комплименты. И в ее адрес и в адрес дяди: «Блестящий ученый, острый ум, смелый экспериментатор...» Наташа прервала собеседника и сама стала рассказывать об исследованиях Федора Степановича все, что запомнилось из его рассказа, — старика иногда одолевала словоохотливость. Иностранец рассеянно слушал и незаметно переводил разговор на какую-то другую тему, хотя к исследованиям дядюшки, словно невзначай, они возвращались несколько раз...

И вот наконец... В тот вечер он ее встретил у себя дома с подчеркнутой галантностью. Когда они сели за стол, он достал из кармана коробочку, раскрыл ее, и на красном бархате ослепительно блеснуло золотое кольцо с бриллиантом.

— Мисс Натали, я буду с вами откровенен. Вы сообщили мне сведения, очень ценные для нашего правительства. Я хотел бы от его имени отблагодарить вас...

Она растерялась, засуетилась, стала отталкивать протянутую коробочку, вскочила с места...

— Я не понимаю, о чем вы говорите?

Он стоял перед ней, этот сухопарый, с виду еще молодой человек в щегольском костюме, с матово поблескивающими, гладко прилизанными волосами и нагло рассматривал ее красивое лицо.

— О, не надо так... Я мог бы сейчас включить магнитофон и предоставить вам возможность выслушать, например, ваш рассказ о работах дяди... Или об МВТУ... Передавая вам этот скромный подарок, я хотел бы попросить вас помочь мне узнать некоторые дополнительные данные, касающиеся дядюшкиной лаборатории. Поверьте, это важно для всемирного прогресса. Наука не может замыкаться в рамках одной страны.

Она, как затравленный зверек, металась по комнате.

— Как вы смеете!.. Вы хотите, чтобы я занялась...

Он подошел к ней и мягко прикрыл ее рот своей большой ладонью.

— Не надо, не надо так говорить, мисс! К чему такие слова? Вы умная девушка. И мы всегда найдем с вами общий язык. Это случается, когда стоит дилемма: или пойти с повинной в Комитет государственной безопасности, или... Не будем больше говорить об этом.. Я хочу выпить за здоровье очаровательной мисс Натали.

Терзания легкомысленной девушки длились недолго. У Наташи не хватило воли пойти с повинной.

— Ваша главная задача, — наставлял иностранец, — отлично учиться, чтобы заслужить право на интересную работу после окончания института. Что я считаю интересной работой? Переводчица большого научного института... Для начала... А в будущем? О, у вас прекрасное будущее, вы должны стать и переводчицей и ученой. Да, да. Вы одаренная девушка, вы будете работать и учиться в институте. Ваш дядя позаботится об этом. Вы пойдете в науку... Вам ясно?..

С того дня Натали перестала быть «Натали» — она теперь «источник информации». У нее есть строгий хозяин, который перестал быть галантным мужчиной, — он приказывает, требует. Они не должны больше встречаться. И вообще ей следует держаться подальше от иностранцев, поближе к советским ученым.

— Ваша главная задача: постарайтесь попасть в отдел Алексея Михайловича... Старик нас очень интересует... Меня вы, возможно, больше никогда не увидите. Связь со мной будете поддерживать через человека, который сам найдет вас в удобном ему месте. Пароль: «Где тут ближайшая булочная?» Вы ответите: «Сейчас я вам покажу». Запомнили? Дальше будете действовать по приказу этого человека. Если вы мне потребуетесь лично, я вас сам найду. Если вы когда-нибудь встретите меня, то не вздумайте по собственной инициативе подойти ко мне.

И он посмотрел на нее своими серыми прищуренными глазами, пренебрежительно скривив губы.

«Человек» дал о себе знать только через полгода. На привокзальной площади к Наташе подошел крепыш атлетического телосложения, в бежевом спортивном костюме. По ней скользнул взгляд холодных, зорких зеленых глаз, широко посаженных на лице с тяжелым подбородком и приплюснутым носом.

— Где тут ближайшая булочная?

На секунду она растерялась, метнула взгляд то в одну, то в другую сторону (позже резидент строго отчитывал ее за это), посмотрела на шагающего рядом с ней человека испуганно и с трудом выдавила:

— Сейчас я вам покажу.

Однако Наташа быстро нашла себя в амплуа «источника информации» под кличкой «Венера». В течение месяца она уже успела заслужить благодарность Атлета — так он приказал называть себя, предупредив:

— Не пытайтесь узнавать мое имя, отчество, фамилию. И фамилию нашего шефа забудьте — он для нас «Аристократ».

Она передала сведения о преподавателях института иностранных языков; о пианисте Ф. из маминой бригады («Часто выезжает на гастроли за границу»); о своем однокурснике Саше («Его посылают работать в торгпредство... Любит крепко выпить и волочиться за девушками»). А вот что касается Димки, его рассказов о строительстве химкомбината в тайге — на это у нее не хватило духу... Почему? Наташа сама не могла в этом разобраться...

Уже была отработана техника связи, облюбованы тайники, один из них в парке, в дупле старого дуба, где Наташа оставляла коробочку или конверт, который потом забирали. Уже было освоено искусство тайнописи и шифра. Она научилась слушать своих собеседников с безразличным видом и в то же время накапливать в памяти целый ворох фактов. Кое-какие сведения о работах Алексея Михайловича уже были переданы иностранной разведке. Но еще недостаточно точные и полные. Разведка ждала более глубокой и квалифицированной информации.

— Хозяин доволен вашей работой. Но пора подниматься на новую ступень, — требовал Атлет.

— Каким образом? Что я еще могу сделать?

— Аристократ просил вам напомнить о вашем самом сильном оружии.

— Каком?

— Вы красивая женщина... Вы рассказывали про Петра Максимовича...

Наташа не подвела Аристократа. Все развивалось так, как было задумано. Она отлично вошла в роль...

[Окончание следует].



Серабрыстым шляхам.
Фотаэцюд С. ГОЛЬДБЕРГА.

## Спяваюць сёстры Сапач

Усе члены працавітай сям'і калгасніка Іосіфа Сапача любяць музыку і песню. Бацька іграе на гармоніку, дочкі Вера і Надзя—спявачкі, сын Міхаіл вучыцца ў Маладзечанскім музычным вучылішчы.

У нядзелю, калі збіраецца ўся сям'я, пачынаецца канцэрт: дзяўчаты спяваюць, а брат і бацька акампаніруюць. Вера і Надзя — актыўныя ўдзельніцы мастацкай самадзейнасці. Разам з іншымі членамі гуртка яны аб'ездзілі ўжо з канцэртамі ўвесь Маладзечанскі раён. Нядаўна, напрыклад, іх шчыра сустракалі ў калгасах «Кастрычнік», «Чырвоны прамень», саўгасе «Маліноўшчына».

Сёстры Сапач славяцца ў калгасе і як лепшыя даяркі.

## Усмешкі гумарыстаў

*Аб'ява на пляжы: «Пасля 17 гадзін мора зачынена».*

*Малады фізік-атамнік убачыў прыгожую дзяўчыну: «Вось гэта спалучэнне малекул акурат для мяне!»*

*Дасведчаны чалавек на пытанне, што стане з маладым пакаленнем, адказаў: «Састарэе і пачне тужыць, што стане з маладым пакаленнем».*

*Аб'ява ў доме састарэлых: «Прыёмны дзень — аўторак. Прыходзіць толькі з устаўленымі зубамі».*

*Лысы да калегі з буйной чупрынай: «Аднак я маю перад табой перавагу. Калі чакаю спаткання з жанчынай, дык мне хопіць папраціць толькі гальштук».*

*Паэт да паэта, які скардзіцца, што крытык разнёс яго новую кніжку: «Не бяры да галавы! Ты ж ведаеш, што гэты папугай толькі паўтарае думкі іншых».*

*Мастак да крытыка, які захапляецца яго «шэдэўрам»: «А-а, гэта... Гэта кавалак палатна, якім я звычайна выціраю пэндзлі. Сохне».*

*Фатограф да кліенткі: «Калі ласка, зрабіце прыемны выгляд твары. Толькі на адзін момант, а потым можаце прыняць нармальны выгляд».*

*Прыяцель да прыяцеля, які незадаволены тым, што першы без дазволу апранае яго непрамакаемы плашч: «Але ж ты, напэўна, не хочаш, каб прамок твой смокінг?»*

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.



Віцебск. Вячэрнія агні.

Фота М. МІНКОВІЧА.

НАШ АДРАС: МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 77 ДОМ ДРУКУ. РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ». ТЭЛЕФОНЫ: 6-19-31, 6-97-92, 6-18-88, 3-15-15.